# ГІСТАРЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ АРГАНІЗАЦЫІ КАФЕДРАЎ ФІЗІЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ

**Грыгарэвіч В.У.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт

HISTORICAL ASPECTS OF THE ORGANIZATION IN HIGHER EDUCATIONAL INSTITUTIONS

Grigorevich V.V.

Hrodna State Medical University

**Анатацыя.** У артыкуле выкладзены аспекты гісторыі стварэння кафедраў фізічнага выхавання ВНУ СССР і БССР у даваенныя і першыя пасляваенныя гады.

**Ключавыя словы:** кафедра, фізічнае выхаванне, вышэйшыя навучальныя ўстановы, гісторыя

**Abstract.** The article presents aspects of the history of the creation of physical education departments of higher education institutions of the USSR and the BSSR in the pre-war and first post-war years.

**Keywords:** department, physical education, higher education institutions, history

***Уводзіны.*** Арганізацыя работы кафедраў фізічнага выхавання (культуры) у вышэйшых навучальных установах СССР (у тым ліку і БССР) прайшла складаны шлях станаўлення, як і ўвогуле ўся дзяржаўная сістэма кіравання фізічнай культурай і спортам у краіне [2]. Удасканаленне іх дзейнасці прадугледжвае ўважлівае рэтраспектыўнае вывучэнне іх гісторыі арганізацыі і працы. Тым больш, што адбывалася нямала арганізацыйных, структурных і функцыянальных пераўтварэнняў [1-8].

*Мэта даследавання*. Прааналізаваць гісторыю стварэння і арганізацыю работы кафедр фізічнага выхавання (культуры) у ВНУ СССР і БССР у даваенныя і першыя пасляваенныя гады.

*Матэрыялы і метады*. У даследаванні выкарыстаны спецыяльная і вучэбная літаратура, дакументальныя і архіўныя крыніцы, прыменены метады аналізу, сінтэзу і абагульнення.

***Асноўная частка***. У СССР у 1927-1928 гадах фізічнае выхаванне студэнтаў было першапачаткова ўключана ў навучальныя планы педагагічных і медыцынскіх ВНУ. У ліпені 1929 года дэкрэтам Рады Народных Камісараў СССР (СНК – тагачасны ўрад) фізічнае выхаванне ўведзена як абавязковы прадмет у выглядзе «Курса фізічнай падрыхтоўкі» у ВНУ РСФСР, а з 1930 года становіцца абавязковым прадметам для ўсіх ВНУ краіны [3]. Аднак на практыцы ўсё ішло значна складаней, перш за ўсё з-за адсутнасці спартыўных збудаванняў, інвентару і педагагічных кадраў. Можна меркаваць, што першыя кафедры фізічнага выхавання (культуры) павінны б ствараюцца ў вядучых ВНУ краіны, перш за ўсё медыцынскіх і педагагічных.



Рэпазіторый ГрГМУ

У Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэце (у 20-30-е гг. XX стагоддзя – Ленінградскім дзяржаўным універсітэце) адзначаецца, што да 1928 года спорт ва ўніверсітэце развіваўся на самадзейнай аснове ў рамках спартовых гурткоў. Пастановай Праўлення ўніверсітэта ў кастрычніку 1928 года фізічная культура ўключаецца ў навучальны план выкладання як абавязковы курс для ўсіх факультэтаў (тэорыя і практыка). Першапачаткова быў утвораны кабінет фізічнай культуры («падрыхтоўкі» хутчэй за ўсё) у 1929 годзе пры існаваўшым ужо кабінеце ваеннай падрыхтоўкі. Ён аб'яднаў некалькіх інструктараў, якія працавалі ў спартыўных гуртках і двух выкладчыкаў.

У пачатку 1930-х гадоў (дакладная дата невядомая) адбываецца падзел кабінета ваенна-фізічнай падрыхтоўкі на ваенную кафедру і кафедру фізічнай культуры [4]. Сцвярджаецца таксама, што ў 1937 годзе ў Ленінградскім універсітэце адчынены першы ў краіне спартовы клуб.

У Ленінградскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. І. Герцэна (цяпер Расійскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт) кафедра фізічнага выхавання была створана 1 кастрычніка 1930 года. Ва ўсякім разе, так сцвярджаецца на сайце ўніверсітэта [5].

У 2-м Маскоўскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце кафедра была арганізавана ў канцы 1930 года, у 1-м Маскоўскім медыцынскім інстытуце імя І. М. Сечанава – у 1931 годзе.

Характэрна, што ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава кафедра фізічнага выхавання і спорту была арганізавана пры ваенным кабінеце МДУ загадам рэктара крыху пазней, у 1933 годзе, і толькі ў 1937 годзе атрымала статус агульнаўніверсітэцкай кафедры ў структуры ўніверсітэта [6].

У БССР у сакавіку 1930 года прадметныя камісіі былі ліквідаваны, а цэнтрамі вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы на факультэтах сталі кафедры [7, с. 238].

Улічваючы малалікасць тагачасных ВНУ, недахоп педагагічных кадраў з фізкультурнай адукацыяй складана ўявіць функцыянаванне паўнацэнных кафедр па фізічным выхаванні. Хутчэй за ўсё гэта былі курсы або кабінеты фізічнай падрыхтоўкі ў межах вайсковых кабінетаў.

У першыя пасляваенныя гады фізічнае выхаванне студэнтаў ажыццяўлялі вайсковыя кафедры. І толькі ў 1947 годзе па прычыне адмены ваеннай падрыхтоўкі ў педагагічных ВНУ краіны (у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР за № 170 ад 29 студзеня 1947 г.) пачынаюць ствараецца кафедры фізічнай падрыхтоўкі [8]. Так, напрыклад, у Гродзенскім педагагічным інстытуце дырэктарам інстытута быў выдадзены загад за № 22 ад 15 лютага 1947 года аб адмене ваеннай падрыхтоўкі і прызначэнні выконваючым абавязкі загадчыкам кафедры фізічнай падрыхтоўкі, якая да гэтага называлася кафедрай ваеннай і фізічнай падрыхтоўкі.

Аналіз сайтаў вядучых ВНУ Беларусі паказвае, што ўсюды кафедры ствараліся, а не аднаўляліся. Напрыклад, у Мінскім педагагічным інстытуце (цяпер БДПУ імя М. Танка) сцвярджаецца, што кафедра створана ў 1947 годзе,



Рэпазіторый ГрДУ

у Мінскім тэхналагічным інстытуце (цяпер БДТУ) таксама ў 1947 , Мінскім медыцынскім інстытуце (цяпер БДМУ) – у 1948, Беларускім політэхнічным інстытуце (цяпер БНТУ) таксама ў 1948 годзе. У БДУ так жа заяўляюць аб стварэнні кафедры ў 1948, хаця сама ВНУ адкрыта ў 1921 годзе. У Гомельскім педагагічным інстытуце (цяпер ГомДУ імя Ф. Скарыны) таксама – 1947, у Віцебскім педагагічным інстытуце (цяпер ВіцДУ ім П. М. Машэрава) так жа ў 1947, у Мінскім інстытуце народнай гаспадаркі (цяпер БДЭУ), Мінскім інстытуце замежных моў (цяпер МДЛУ) у 1949 годзе. У Віцебскім медыцынскім інстытуце (цяпер універсітэт) год заснавання кафедры – 1949, хаця заняткі па фізічнай культуры праводзяцца, як сцвярджаецца на сайце, з 1935 года.

Безумоўна для адкрыцця (стварэння, арганізацыі) кафедры неабходны быў загад кіраўніка ВНУ або пастанова (рашэнне) рады арганізацыі, што з'яўлялася б афіцыйным дакументальна пацверджаным фактам.

***Заключэнне.*** Такім чынам, можна сцвярджаць, што стварэнне кафедраў фізічнага выхавання (культуры) у БССР як самастойных структурных падраздзяленняў ВНУ праходзіла ў 1947-1948 гг. Пры гэтым яны былі малалікія па колькасці выкладчыкаў (3-5 чалавек), са слабой матэрыяльна-спартыўнай базай, практычна адсутнічалі крытыя спартыўныя збудаванні. Заняткі праводзіліся ў асноўным на вуліцы са студэнтамі 1-2-х курсаў.

**Список литературы:**

1. Григоревич, В. В. Исторические аспекты организации кафедр физического воспитния в высших учебных заведениях / В. В. Григоревич // Физическая культура как базовый компонент жизненной стратегии личности [Электронный ресурс] материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 19-20 мая 2021 г. / УО ВГАВМ; редкол. Н. И. Гавриченко (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГАВМ, 2021. – С. 96-97.

2. Голощапов, Б. Р. История физической культуры и спорта: учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / Б. Р. Голощапов // – 4-е изд., испр. – М.: Издательскиий центр «Академия», 2007. – С. 147-161.

3. Столбов, В. В. История физической культуры и спорта / В. В. Столбов, Л. А. Финогенова, Н. Ю. Мельникова. – 3-е изд., перераб. и доп. – М.: Физкультура и спорт, 2000. – С. 207-208.

4. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: htts://sport.spbu.ru/o-kafedre/istoriya. – Дата доступа: 16.02.2021.

5. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: htts://www.herzen.spb.ru/main/ structure/ inst/ifks/1448188957/1448195412/. – Дата доступа: 6.04.2021.

6. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https: //www.msu.ru/info/ struct/dep/sport.htme. – Дата доступа: 16.02.2021 г.

7. Сянькевіч, Г. Р. Народная адукацыя і педагагічная навука у Беларусі (1917-1945) / Г. Р. Сянькевіч, А. В. Трухан, З. М. Ціток [і інш.] ; пад рэд. Г. Р. Сянькевіч [і інш.] – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 495 с.

8. Максимович, В. А. Становление, этапы и перспективы развития кафедры физического воспитания и спорта Гродненского государственного университета имени Янки Купалы (1947-2012 гг.) / В. А. Максимович, С. К. Городилин, В. В. Григоревич // Физическое воспитание и современные технологии формирования физической культуры личности студента: сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я. Купалы; редкол.: С. К. Городилин, А. И. Шпаков; под науч. ред. В. А. Максимовича. – Гродно: ГрГУ, 2013. – С. 21.



Репозиторий ГрГМУ